Выдаецца з 16 студзеня 1998 г.
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец — рэдакцыя газеты НАВІНЫ
Наклад 18 450.
Адрас для карэспандэнцыі:
220088, г.Мінск,вул. Іванаўская, 56.
Тэл/факс: 236 8549

НАВІНЫ

Серада, 17 чэрвеня 1998 г. № 64 Кошт свабодны

СВАБОДА

Забаронена 24 лістапада 1997 г.

Першы афіцыйны візіт пасля перавароту

Старшыня Вярхоўнага Савета Сямён Шарэцкі знаходзіцца з афіцыйным візітам у Польшчы па запрашэнні спікера польскага Сейма.

Шарэцкага суправаджаюць 11 дэпутатаў — віцэ-спікер Генадзь Карпенка, члены прэзідыума Мечыслаў Гіруць, Сямён Домаш і Сяргей Калякін, а таксама кіраўнікі асноўных камісій разагнанага парламента і лідэр Саюза палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін. Дэлегацыю прымаюць на адпаведным узроўні, у прыватнасці, адбудуцца сустрэчы з кіраўнікамі Сейма і Сената.

У гутарцы з журналістамі Сямён Шарэцкі падкрэсліў, што гэта першы афіцыйны візіт старшыні ВС Беларусі пасля дзяржаўнага перавароту 1996 г. Ён таксама адзначыў, што запрашэнне маршалка польскага Сейма важнае для беларускага парламента, які адмовіўся стаць «кішэнным» парламентам прэзідэнта Лукашэнкі, паколькі Польшча — гэта не толькі суседняя дзяржава, але і краіна, якая сёлета ўзначальвае АБСЕ.

Людміла ГУЛЯКЕВІЧ

Тэлеграма ад «Газпрома»

Канцэрн «Газпром» прыслаў прэм'ер-міністру Сяргею Лінгу тэлеграфнае паведамленне, аб скарачэнні з 15 чэрвеня паставак у Беларусь расійскага прыроднага газу на 40%.

Па словах кампетэнтнай урадавай крыніцы, асноўная прычына такога рашэння — запазычанасць Беларусі расійскім пастаўшчыкам у памеры 240 мільёнаў долараў, якая не скарачаецца.

Як вядома, у красавіку гэтага года старшыня праўлення «Газпрома» Рэм Вяхіраў і прэм'ер С.Лінг падпісалі ў Мінску праграму пагашэння запазычанасці. Згодна з дакументам, беларускі бок абавязаўся поўнасцю аплачваць пастаўкі газу: суадносіны грашовай і таварнай частак плацяжоў складаюць 26% грашыма, 74% — таварамі. Аднак, па некаторых звестках, падпісаны пратакол выконваецца Беларуссю не больш чым на палову.

На абарону Брэсцкай крэпасці

Каля 65 тысяч долараў ЗША пералічылі ў гэтым месяцы Расія і Казахстан на рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой».

Як паведаміў дырэктар мемарыяльнага комплексу Валерый Губарэнка, паўтара года таму дванаццаць краінаў СНД дамовіліся аб сумесным фінансаванні рамонтных і рэстаўрацыйных работ у крэпасці. На працягу трох гадоў незалежныя дзяржавы абавязаліся пералічыць на гэтыя мэты 2 мільёны долараў.

БелаПАН

А калі б у Маскве знішчалі апошнюю рускую школу?

Пікет у абарону Беларускага гуманітарнага ліцэя адбыўся ўчора ў Міхайлаўскім скверы Мінска. Каля сотні вучняў, іх бацькі і настаўнікі сталі ўздоўж тратуараў з плакатамі, агульны сэнс якіх можна вызначыць лозунгам «Не аддамо Беларускі ліцэй!» Хто ж збіраецца яго адабраць?

Юныя пікетоўшчыкі ўпэўненыя, што супраць іх дзейнічаюць высокія чыноўнікі, для якіх існаванне хаця б адной цалкам беларускай установы — як костка ў горле. *«Магчыма, яны не любяць наш ліцэй якраз таму, што мы яго вельмі любім і гатовыя яго бараніць»*, — лічыць вучаніца 2-га курса Марына Кудзіна. Яна трымае ў руках плакат *«Наш ліцэй — наш дом. Усюды добра, а дома лепей»*. Марына ўпэўненая, што, стоячы ў пікеце, пад дажджом і на халодным ветры, яна змагаецца за тое, каб у яе доме было цёпла і ўтульна. *«Я раблю гэта дзеля сябе»*, — кажа ліцэістка. А вось 14-гадовы Алесь Лях любіць свой ліцэй за дэмакратычныя парадкі. *«У ліцэі мне цікава і дыхаецца вольна. Там я адчуваю сябе чалавекам, якога паважаюць. Хіба за гэтае пачуццё не варта змагацца?»* — пытаецца хлопец.

Колькі дзён альбо нават тыдняў давядзецца змагацца — ліцэісты не ведаюць. На гэтае пытанне не мае адказу і дырэктар ліцэя Уладзімір Колас. Ён хацеў бы, каб пікет застаўся адзінай дэманстрацыяй гатоўнасці ліцэістаў, іх бацькоў і настаўнікаў «стаяць да канца». Дырэктар лічыць, што яшчэ ёсць шанц дамовіцца з аўтарамі ідэі «аб'яднання» мірным шляхам. *«Ім трэба зразумець, што тут адстойваецца права на адукацыю, якую дзеці павінны атрымліваць пры любым палітычным рэжыме»*, — заяўляе Уладзімір Колас.

Аднак не бачна прыкметаў таго, што да навучэнцаў Беларускага гуманітарнага ліцэя збіраюцца прыслухацца. За ўвесь час пікета да ліцэістаў не выйшаў ніводны чыноўнік, хаця ад Міхайлаўскага сквера да Дома ўрада — усяго некалькі сотняў метраў. Бацькі ліцэістаў збіраюцца накіраваць па ўстановах новыя дэлегацыі. З адкрытымі лістамі прапанавана звярнуцца да прэм'ера Сяргея Лінга і міністра адукацыі Васіля Стражава. Не забыліся і пра віцэ-прэм'ера Уладзіміра Замяталіна, якому прыпісваюць аўтарства ідэі «аб'яднання». Асабіста яму пікетоўшчыкі прысвяцілі спецыяльны плакат: *«Сп.Замяталін! А калі б знішчалі апошнюю рускую школу ў Маскве?»*

Па словах ліцэістаў, за чатыры гадзіны пікетавання яны сабралі амаль паўтысячы подпісаў людзей у падтрымку ліцэя.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Бізнесменам не дазволілі сабрацца

Гродзенскія гарадскія ўлады не дазволілі мясцовым прадпрымальнікам правесці ў панядзелак прафсаюзны сход.

Прычына адмовы такая: прафсаюз дагэтуль не зарэгістраваны. Анекдатычнасць сітуацыі ў наступным. Упраўленне юстыцыі адклала рэгістрацыю, прапанаваўшы прафсаюзу ўнесці некаторыя змены ў статут. Сход прадпрымальнікаў якраз павінен быў абмеркаваць магчымыя змены. Кола замкнулася. Каб разарваць яго, прафсаюз прадпрымальнікаў будзе змагацца за свае правы ў судзе.

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

Банкі разжыліся доларамі

Жыхары нашай краіны трымаюць у беларускіх банках 151 мільён долараў.

За травень рост склаў амаль 7 мільёнаў долараў. Па прагнозах Нацбанка, да канца года валютныя дэпазіты насельніцтва могуць дасягнуць нават 500 мільёнаў долараў.

БелаПАН

Кангрэс журналістаў

Цяжкі хлеб міністра Падгайнага

На кангрэсе еўрапейскіх журналістаў, які праходзіў у Варшаве, старшыня беларускага Дзяржкамдруку Міхаіл Падгайны спрабаваў развеяць «міфы» пра ўціск свабоды прэсы на Беларусі.

Аднак справіцца з гэтым даручэннем таварышу міністру не ўдалося. І не толькі таму, што ён не змог сам агучыць прывезены з Мінска даклад на англійскай мове (тэкст прамовы чытала перакладчыца). Цяжэй было іншае — канкрэтныя пытанні да Падгайнага з боку ўдзельнікаў форуму. Напрыклад, галоўны рэдактар найбуйнейшай польскай «Газеты Выборчай» прыгадаў і канфіскацыю на мяжы аўдыё-відэаматэрыялаў у журналістаў, і забарону СВАБОДЫ, і закрыццё «Радыё 101,2», і суды за надпісы на сценах і іншыя факты. Падгайны апраўдваўся як мог: маўляў, мяжа — гэта не перашкода (бо «ёсць Інтэрнэт»), а што датычыць законаў, дык некаторыя акты і яму самому не падабаюцца, ён за іх ні ў якім выпадку не галасаваў бы, але ён нават не меў магчымасці выказаць сваё меркаванне на гэты конт, паколькі працуе на пасту міністра зусім нядаўна, усяго паўгода. Ну, а радыё — гэта ўвогуле не ягоная «парафія»...

Адам Міхнік, які ў свой час браў інтэрв'ю ў беларускага прэзідэнта, зазначыў, што ён ужо чуў падобныя словы з вуснаў Аляксандра Лукашэнкі.

Людміла ГУЛЯКЕВІЧ

У панядзелак у мінскай штаб-кватэры СНД прайшло першае паседжанне форуму па праблемах рэфармавання садружнасці. Адзін дзень пагаварылі і раз'ехаліся.

На здымку: «ветэран СНД» Іван Каратчэня побач са сваім новым шэфам Барысам Беразоўскім.

Валютныя пакуты

Як купіць «долары-марачкі»?

Падрыхтоўка да адпачынку ў беларусаў выклікае шмат спецыфічных праблемаў, невядомых жыхарам цывілізаваных краінаў. Калі вы прынялі рашэнне адпачыць за межамі Беларусі, адразу ўзнікае пытанне — дзе ўзяць валюту?

Чаргу займаюць з ночы

Яшчэ некалькі тыдняў таму банкаўскія абменныя пункты нагадвалі форты ў асадзе — вакол іх збіраліся чэргі, цэлыя натоўпы людзей, якія спадзяваліся набыць валюту. Цяпер гэтыя натоўпы значна зменшыліся, гэтаму ёсць прычыны.

У банкі цяпер здаюць зусім мала валюты. А паколькі абменныя пункты абавязаныя прадаваць толькі 30% ад набытай валюты, то можна прастаяць увесь дзень, нават першым у чарзе, але так і не купіць 100 долараў.

Каб быць першым у чарзе, трэба прыходзіць не ў 7 гадзін раніцы, а значна раней. Перад некаторымі абменнікамі чэргі займаюцца з ночы. Мая знаёмая выйшла на «валютнае паляванне» ў 2 гадзіны ночы і сумленна прастаяла ў чарзе ўвесь дзень. Вынік — купіла 80 долараў.

Такім чынам, калі няма знаёмых ў банку, няма некалькіх вольных дзён, якія можна патраціць на стаянне ў чэргах, няма моцных нерваў і жалезнага цярпення — кіньце надзею купіць долары ў абменным пункце. Застаецца адзінае — шлях да валютчыкаў, на чорны рынак.

Чорны рынак

У кожным горадзе ёсць месцы, дзе канцэнтруецца гандаль валютай. Звычайна гэта рынкі. У Мінску лідэрства трымае Камароўка. Шматлікія патрулі АМОНа перашкаджаюць, але тым не менш рынак працуе. Курс залежыць ад сумы абмену. Махлярства і продаж фальшывых долараў здараецца вельмі рэдка.

Канечне, кантакты з валютчыкамі маюць негатыўныя бакі. Па-першае, гэта справа рызыкоўная — перыядычна на адлоў насельніцтва выходзяць супрацоўнікі праваахоўных органаў у цывільным. Па-другое — даводзіцца купляць валюту па высокім курсе (не ніжэй, чым 57 тысяч за долар).

Цікавы факт паведаміла «Новая газета Смаргоні». У гэтым горадзе супраць адной жанчыны, якая купіла ў валютчыка 10 долараў, узбудзілі нават крымінальную справу «за незаконныя валютныя аперацыі», а прадавец валюты быў прыцягнуты толькі да адміністрацыйнай адказнасці. Жанчыну прызналі «крымінальніцай», бо яна паўторна ўчыніла падобнае парушэнне.

Замест грошай

Яшчэ адна праблема — вываз валюты з Беларусі абмежаваны 500 доларамі. На большую суму трэба мець даведку ад банка, які прадаў валюту. Але можна купіць дарожныя чэкі накшталт «Томас Кук». Набыць іх можна, напрыклад, у Знешэканомбанку, Пріорбанку, Белпрамбудбанку і іншых. Але і з чэкамі цяпер праблемы. Чуткі наконт павелічэння мытных пошлінаў на іншамаркі выклікалі вялікі попыт на чэкі. Яшчэ адно выйсце — застаюцца міжнародныя пластыкавыя карткі, якія таксама можна набыць у банках. На іх, як і на чэкі, дазволу на вываз не патрабуецца.

Алесь САДОЎСКІ

Падпіска працягнутая да 20 чэрвеня. Не спазніся!

Падпіска на газету НАВІНЫ прымаецца ва ўсіх аддзяленнях пошты і Белсаюздруку

Кошты падпіскі:
на адзін месяц – 40 000 рублёў
на тры месяцы – 120 000 рублёў
на шэсць месяцаў – 240 000 рублёў

Наш падпісны індэкс **63312**

Італія бліжэй, чым Літва?

Беларускі педагагічны універсітэт імя Максіма Танка ў перспектыве будзе рыхтаваць выкладчыкаў беларускай і літоўскай мовы і літаратуры для літоўскіх школ у Беларусі і беларускіх — у Літве.

Такое рашэнне прынялі ўдзельнікі беларуска-літоўскага «круглага стала» па праблемах адукацыі і культуры беларускай дыяспары ў Літве і літоўскай дыяспары ў Беларусі, які адбыўся 12-13 чэрвеня ў вёсцы Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. Па словах дырэктара Нацыянальнага культурна-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны прафесара Адама Мальдзіса, «*культурныя кантакты паміж Беларуссю і Літвой аслабелі і не могуць параўнацца з аналагічнымі беларуска-французскімі або беларуска-італьянскімі адносінамі*». Адным з першых крокаў будзе аднаўленне Беларускага музея ў Вільні як цэнтра беларускай культуры ў Літве.

БелаПАН

Сабантуй у Смілавічах

У мінулыя выхадныя ў пасёлку Смілавічы непадалёк ад Мінска прайшло свята татарскай культуры сабантуй (з татарскай — «свята плуга»).

У Смілавічы прыехалі прадстаўнікі татарскай грамадскасці з многіх гарадоў Беларусі. Сёння ў краіне жывуць каля 12,5 тысячы татар; найбольш буйныя нацыянальныя абшчыны ў Мінску, Гродне, Іўі, Навагрудку і Смілавічах. Летась беларускія татары адзначылі 600-годдзе свайго пасялення на землях Вялікага Княства Літоўскага.

Кіраўнік мінскай татарскай абшчыны, кандыдат гістарычных навук Ібрагім Канапацкі паказаў удзельнікам свята мячэць і старадаўні мізар (мусульманскія могілкі) Смілавічаў. На майдане ў даліне ракі Волма адбыліся конныя спаборніцтвы, татары змагаліся ў стральбе з лука і нацыянальнай барацьбе.

Адным з галоўных гасцей свята быў памочнік прэзідэнта Беларусі Урал Латыпаў.

БелаПАН

64 каровы хацелі стаць расіянкамі

Чым далей дзяржава стрымлівае цэны, тым больш тавараў вязуць у Расію, дзе з цэнамі ўсё ў парадку.

Лічбы, што прыводзіліся на апошнім паседжанні Магілёўскага аблвыканкама, уражваюць. Толькі з сакавіка да пачатку чэрвеня гэтага года мытныя і міліцэйскія пасты затрымалі каля 650 тон мукі і хлеба, амаль 120 тон мяса, 21 тону масла, 44 тоны малака і тварагу. Спрабавалі вывезці нават 64 жывыя каровы. Дасведчаныя людзі сцвярджаюць, што памежнікі і мытнікі ловяць толькі малую частку такога экспарту. Як вынік, у гандлі Магілёва апошнія два тыдні цяжка купіць каўбасу і іншыя мясныя прадукты. Выйсце з сітуацыі чыноўнікі бачаць у адміністрацыйным рэгуляванні. Але ж яно дапамагае слаба.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Кожны дзень – чатыры ахвяры

На Гродзеншчыне за апошнія два тыдні загінула 58 чалавек, 20 з іх патанулі ў рэках і вадаёмах.

Такая смерць заўсёды недарэчная. Напрыклад, у Гродне адзін малады хлопец палез у Нёман, каб дастаць мяч, і на бераг не вярнуўся. А вось у Воранаўскім раёне малады калгаснік зваліўся ў студню каля сваёй хаты і ўтапіўся. Другі калгаснік сядзеў у хаце на верандзе і быў забіты маланкай. Адна калгасніца загінула пад коламі трактара, кіроўца якога ладаваў сіласную яму.

Святлана ЖУК

Крымінальныя «разборкі» у Брэсце

У мінулыя выхадныя ў Брэсце пахавалі вядомага крымінальнага аўтарытэта.

48-гадовы, тройчы судзімы Аляксандр Лагвіновіч быў цяжка паранены падчас крымінальнай разборкі і памёр у рэанімацыі. Па версіі следства, Лагвіновіч са сваімі паплечнікамі спрабаваў высветліць адносіны з канкуруючай крымінальнай групоўкай. Брэсцкі аўтарытэт хацеў падвысіць свой статус, стаць «злодзеем у законе» і падпарадкаваць сабе іншыя злачынныя групы горада. Сходка, якая скончылася для Лагвіновіча трагічна, была прызначана за Брэстам на рацэ Лясной. Канкурэнты спачатку расстралялі аўтарытэта з пісталета, а потым кінулі яму пад ногі гранату. Неверагодна, але і пасля «свінцовага пачастунку» Лагвіновіч яшчэ 10 дзён заставаўся жывым. Каля ўваходу ў рэанімацыйную палату, дзе ляжаў цяжка паранены аўтарытэт, быў выстаўлены міліцэйскі пост — следства апасалася, што злачынцы паспрабуюць дабіць Лагвіновіча. Брэсцкая міліцыя сцвярджае, што ўсе 15 удзельнікаў крывавай разборкі ўжо затрыманыя.

Язэп СІНІЦКІ

Кошты рэкламнай плошчы ў газеце НАВІНЫ

на першай паласе — 94 000 руб./см²
на асобнай паласе — 70 000 руб./см²
у рэкламным блоку — 47 000 руб./см²
у тэлевізійнай праграме — 70 000 руб./см²
на апошняй паласе — 70 000 руб./см²

Тэлефон для даведак: 236-85-49

КАДРЫ

Абарона правоў чалавека наступальнымі метадамі

Прэзідэнцкія дэпутаты збіраюцца правесці «парламенцкія слуханні» па праблеме захавання правоў чалавека.

Але справа не ў тым, што «палатачнікаў» моцна хвалюе стан гэтых правоў у нашай краіне. Проста прэзідэнт нядаўна зацвердзіў спіс мерапрыемстваў да 50-годдзя Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, і парламенцкія слуханні значацца адным з пунктаў.

Спікер Малафееў ужо распачаў дзейнасць і правёў у палаце нараду па падрыхтоўцы да слуханняў. У ёй бралі ўдзел такія вядомыя праваабаронцы, як Міхаіл Мясніковіч, Іван Антановіч, старшыні Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў, а таксама «спецы» па правах чалавека з ведамства Шэймана, генпракуратуры, мінюста і МУС. Уся гэтая шаноўная публіка сцвярджала, што кіраўніцтва Беларусі надае вялікую ўвагу праблеме правоў чалавека, у чым, дарэчы, па іхніх словах, могуць пераканацца заходнія назіральнікі — на слуханні ў палату плануюць запрасіць супрацоўнікаў місіі АБСЕ, парламентарыяў з Расіі, Украіны і Малдовы, а таксама прадстаўнікоў беларускіх недзяржаўных арганізацыяў.

Дакладчыкам на слуханнях будзе выступаць галоўны гарант захавання правоў і свабод нашых грамадзянаў прэзідэнт Лукашэнка. Міністр замежных справаў Антановіч сказаў, што для Беларусі правядзенне гэтага мерапрыемства — «не абарона, а нападзенне». Антановіч прапанаваў зрабіць такія напады штогадовымі.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

ПОШТА

Мой тебе совет, Саша...

Мне много раз доводилось читать в независимых газетах о том, как в нашей стране расправляются со всем белорусским. Доходит до абсурда, когда в Минске избивают за то, что человек заговорил по-белорусски. Газеты указывают на разных людей, виновных в таких делах. Однако мне хочется сказать, что больше всех виновен мой земляк, президент Лукашенко. Мы с ним родом из одной деревни Александрия Шкловского района. Там росли, играли в волейбол, футбол и ходили на танцы. Наши матери работали на одной и той же ферме доярками. Мы ходили в одну и ту же школу. У нас в деревне не было презрения ко всему белорусскому. Отчего у президента презрение — я не могу понять. В старших классах его учила белорусскому языку будущая теща, Костюкович Елена Федоровна. Может, он так делает назло любимой теще?

Мы оказались в экономической и политической изоляции. Если тебе, Саша, постоянно докладывают о небывалом росте в народном хозяйстве, то в действительности его нет. Когда ты пришел к власти, на заводе в нашем городке работало около девяти тысяч человек, теперь — менее трех тысяч, да и тем нету работы. В строительной организации, где работал я, было 180 человек, теперь осталась половина. И так везде.

Мой тебе совет: примени свои силы не на разгон демонстраций и суды с инакомыслящими, а на хозяйственные нужды. Ведь в деревне, где ты родился, нет ни хорошей дороги, ни водопровода, ни газопровода. А почему бы тебе не помочь восстановить дома своим бывшим односельчанам? Ты побывал в Германии, Японии, Америке и видел, какие там дороги и какие дома. Да и свою нацию они стараются сохранить, в противоположность белорусам. Может быть, ты скажешь, что в казне нет денег? Тогда сократи репрессивный аппарат. Ведь большинство твоих служак все равно не занимаются делом.

Г.ДУРОВ,
г.Барань Витебской обл.

БЕЛАРУСЬ–РАСІЯ

Перспектывы «саюза двух»

Погляд з Захаду

Штодзённая нямецкая газета *Frankfurter Rundschau* апублікавала даследаванне Хайнца Тымермана, вядомага спецыяліста па Беларусі з кёльнскага навуковага Інстытута ўсходнееўрапейскіх і міжнародных праблем. Даследаванне прысвечана «саюзу Масквы з дыктатарам Лукашэнкам». Мы публікуем некаторыя фрагменты артыкула нямецкага даследчыка.

За няпэўным словам «інтэграцыя» Масква і Мінск хаваюць дзве супрацьлеглыя канцэпцыі, паміж якімі вельмі складана знайсці кампраміс. Расійскае кіраўніцтва нацэлена на стварэнне адзінай дзяржавы па нямецкім узоры. Дэ факта гэта прывядзе да паглынання Беларусі Расіяй. Лукашэнка ж імкнецца да саюза дзвюх раўнапраўных краінаў, якія застануцца суб'ектамі міжнароднага права. Гэтыя разыходжанні перашкаджаюць увасабленню інтэграцыйнай рыторыкі ў канкрэтныя крокі. Палітычная эліта абедзвюх краінаў таксама мае розныя погляды на аб'яднанне.

У прыватнасці, расійская эліта бачыць найперш стратэгічныя мэты, такія, напрыклад, як захаванне абаронных пазіцыяў на заходніх межах, далейшае выкарыстанне вайсковых сістэмаў на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, Беларусь з'яўляецца для Расіі надзейнай транзітнай краінай на Захад. Яна лічыцца альтэрнатывай Украіне, якая разглядаецца патэнцыйна нелаяльнай да Масквы. 70 працэнтаў расійскага гандлю з Еўропай праходзіць праз Беларусь. Усё гэта прымушае Маскву, нягледзячы на выбрыкі Лукашэнкі, трымаць яго ў якасці гаранта цесных адносінаў з Расіяй.

Саюзнікі прэзідэнта Лукашэнкі — расійскія нацыяналпатрыёты — без аглядкі падтрымліваюць ягоны саюзны праект. Падобныя прыхільнікі ёсць і ў вярхах (былы прэм'ер-міністр Чарнамырдзін і цяперашні міністр замежных спраўваў Прымакоў). Але ліберальная частка расійскай эліты не імкнецца да інтэграцыі з краінай, якая арыентаваная на сацыялізм савецкага тыпу. Акрамя таго, расійска-беларускі саюз можа падрываць федэральную структуру РФ. Многія рэспублікі і нават асобныя вобласці ўжо адкрыта выказваліся за падняцце ўласнага статусу да ўзроўню Беларусі. Гэта непазбежна мініравала б і без таго неўстойлівую сітуацыю ў Расіі з яе 89 суб'ектамі.

Лукашэнка і яго прыхільнікі мараць пра аднаўленне Савецкага Саюза. Ядром гэтага працэсу ім бачыцца славянскі саюз Расіі, Украіны і Беларусі, у якім будуць наднацыянальныя органы з вялікай кампетэнцыяй. Гэта быў бы важны крок на шляху да «агульнага дома брацкіх народаў», на чале якіх Лукашэнка бачыць сябе.

Але пакуль нават «саюз двух» застаецца, па сутнасці, толькі на паперах і ў заявах. Пасля падпісання саюзнай дамовы беларуска-расійскі клімат не палепшыўся, а хутчэй пагоршыўся. За правалы інтэграцыйных планаў Лукашэнка абвінавачвае высокапастаўленых асобаў у Маскве, якія тарпедзіруюць развіццё саюза, «выконваючы даручэнне з-за акіяна». Лукашэнка не прымае сінхранізацыі эканамічных рэформаў па расійскім узоры. Расійскія рэфарматары саркастычна выказаліся, што пры такіх абставінах інтэграцыя абедзвюх краінаў гэтак жа малаверагодная, як інтэграцыя Паўночнай і Паўднёвай Карэі ці Кубы і Фларыды.

Якія ж перспектывы маюць беларуска-расійскія адносіны? Першы сцэнарый магчымы пры ўзрастанні канфрантацыі Расіі з Захадам. Пры такім павароце падзеяў (што, аднак, выглядае малаверагодным) рэжым Лукашэнкі замацаваўся б знутры, бо расійскае кіраўніцтва было б гатовае да вялікіх саступак адзінаму саюзніку ў стратэгічнай зоне.

Другі сцэнарый дачытыць узмацнення рэфарматарскага крыла ў Маскве і далейшага пашырэння супрацоўніцтва з Захадам. Пры такім (больш верагодным) развіцці падзеяў, квазі-дыктатарскі і варожы да рэформаў беларускі партнёр стане абузай для Масквы і перашкодай на шляху ўсталявання агульнаеўрапейскіх каштоўнасцяў і прынцыпаў. У гэтым выпадку Масква, відаць, падтрымае тыя сілы ў Мінску, якія хочуць замяніць цяперашняга прэзідэнта на іншага лідэра, адкрытага рэформам і адначасова дружалюбнага Расіі.

Па трэцім сцэнарыі Расія будзе заплюшчваць вочы на рэпрэсійны курс Лукашэнкі і пабуджаць моцныя фінансава-прамысловыя групы ўзмацняць кантроль над энергетычнай інфраструктурай Беларусі. Пры гэтым Масква будзе ціснуць на Мінск, каб сінхранізаваць эканамічныя сістэмы, уключаючы прыватызацыю і прававую сферу. Інакш адкрытая расійска-беларуская мяжа можа стварыць цяжкасці для самой Расіі.

Падрыхтаваў
Алесь ДАШЧЫНСКІ

Лукавая улыбка Дядюшки Сэма

США ставят на Литву

Судя по заявлению американского посла в Литве Кита Смита, наши соседи уже в этом году могут рассчитывать на серьезное вливание в экономику страны.

Масса фактов позволяет говорить об особом интересе США к Литве. Начнем с того, что американцы лидируют по размерам прямых инвестиций в литовскую экономику: на 1 января 1998 года они составили 263 миллиона долларов. Причем Америка бьет рекорды и по величине отдельных проектов: табачная фабрика *Philip Morris* в Клайпеде — около 62 миллионов, *Motorola* — 60, *Masterfood* — 8,8, *Coca-Cola* — 16, *Kraft Jacobs Suchard* — 15,5, *Lancaster Steel* — 43, *McDonald's Restaurants* — 6 и т.д. Это примерно одна пятая всех финансовых вливаний.

Однако, по выражению посла Смита, это были только семечки. Уже в этом году возможна американская инъекция на полмиллиарда долларов. Из более-менее определившихся инвесторов — *Williams International*, желающая основательно обосноваться в нефтяном секторе, *Power bridge*, объявленная победителем в конкурсе на прокладку линии электропередач в Польшу, *Penninox*, продемонстрировавшая макет сталеобрабатывающей фабрики, которую она намерена построить в Клайпедской свободной экономической зоне, и др.

Смена пластинки

США входили в Литву, не особенно афишируя себя, но очень основательно. По существу с первых же дней независимости они неназойливо и тонко лепили сам остов экономической политики. Каналом такого влияния стал Международный валютный фонд, с которым с 1992 г. Литва подписала и в основном выполнила 4 экономических меморандума. Главным из этих обязательств, как известно, стало введение в 1994 году системы валютного управления, а также привязка лита к доллару.

Однако в середине прошлого года Банк Литвы, вежливо поблагодарив Всемирный банк за помощь, заявил, что дальше «играть» Литва попытается самостоятельно, и подписывать очередной пятый меморандум отказался. Интеллектуалы банка во главе с Гитанасом Науседой разработали толковую программу, в которой наметили пути и последовательность восстановления самостоятельности центрального банка в полном объеме его функций и «развода» лита с долларом с тем, чтобы сразу «женить» его на евро. Такое своеволие явно огорчило американцев: это было заметно по довольно кислой реакции МВФ.

Однако Вашингтон был бы скверным дипломатом, если бы в подобной ситуации начал оказывать нажим. Тем более что и особой необходимости в этом нет: литовские власти вовсе не собираются отказываться от американского присутствия. Именно в этот момент появляется другая «троянская лошадка» — Балтийская хартия. Причем принятая безо всякого насилия.

Неустанные заботы Кита Смита

Американский посол Кит Смит проявляет повышенный интерес к литовскому бизнесу. Настолько заметный, что некоторые депутаты Сейма даже засомневались, не превышает ли он своих дипломатических полномочий. Он, например, взялся лично протежировать ход переговоров с *Williams International*: пересылал премьеру письма, подчеркивая особое внимание к этой компании со стороны Госдепартамента, встречался с министром хозяйства В.Бабилюсом... В итоге переговоры с *Williams* прошли чрезвычайно оперативно, договор с компанией был подписан. Причем безо всяких отягощающих формальностей вроде тендера. В Сейме министра за это немножко пожурили, но «одобрямс» дали.

Побывал посол и в Клайпеде, где в основном общался с бизнесменами. В том числе со своим соотечественником Д.Конори, вице-президентом корпорации *Penninox*. Здесь он буквально вскружил голову публике радужными перспективами прихода янки в Литву, после чего инвестиции со всего мира потянутся нескончаемыми вереницами. Как это было в Венгрии или, скажем, в Польше.

Для служения этой высокой цели посол благословил 31 марта организацию «Литовско-американская предпринимательская инициатива», которая объединяет частные лица, предприятия, научные учреждения и неправительственные организации. Костяк ее образует группа предпринимателей, которые стажировались два года в Америке на средства Международного агентства развития.

Мини-NATO вас устроит?

В Вильнюс приезжал специальный помощник американского президента, он же — вице-президент нью-йоркского банка *Credit Suisse First Boston* Ричард Холбрук. Проведя в литовской столице лишь несколько часов, он тем не менее успел заметить особые успехи Литвы, дающие основания в Вашингтоне делать на нее особую ставку — как на важнейший фактор стабильности и мира в регионе.

Растаяв от комплиментов, хозяева бросились выяснять, каковы ближайшие перспективы Литвы относительно *NATO*. Однако гость касаться этой темы не стал, сославшись на то, что она не входит в программу его визита. Но настойчиво рекомендовал укреплять региональную интеграцию с участием Балтии, Скандинавских стран и Польши.

Из всего, что предлагалось и наговаривалось с американской стороны, складывается впечатление, что лукавит Дядюшка Сэм, ох, лукавит. Вовсе ему не хочется, чтобы балтийцы расширили географию *NATO*. Зачем Америке усиливать европейских союзников, которые становятся все капризнее? США скорее устраивает нечто вроде малой балтийской Антанты, которая выполняла бы сразу две задачи: создавала буферную зону между ставшей слишком независимой Западной Европой и одновременно не раздражала бы российского медведя. Для страны, которая привыкла свое влияние на «мировой порядок» поддерживать с помощью баланса сил, слишком большое усиление *NATO* — стратегически опасная тенденция.

Для этой роли нужна экономически сильная и зависимая от американского капитала Балтия. Литва, имеющая такую обширную диаспору в США и тесные связи с Польшей, и впрямь наиболее подходящая фигура в этом геополитическом пасьянсе.

Политика политикой, но рядовые литовцы от этого явно выигрывают.

Владимир ТРОИЦКИЙ,
Вильнюс

Мост из Европы в Азию

Одним экономическим союзом в мире стало больше

Одиннадцать стран-участниц Черноморского экономического сотрудничества (ЧЭС) — Азербайджан, Албания, Армения, Болгария, Греция, Грузия, Молдавия, Россия, Румыния, Турция и Украина — подписали совместную декларацию, провозгласившую создание международной экономической организации. Ее главная задача — стать «мостом», соединяющим транспортные системы Китая, Средней Азии и Ближнего Востока с Европой. Все транспортные пути из Азии в Европу проходят через регион Черного моря. По мнению экспертов, Евросоюз заинтересован в тесном сотрудничестве с новой организацией. Транспортная структура ЕС доходит пока только до черноморских портов, а продвижение в Азию необходимо. Евросоюз уже сейчас вкладывает деньги в развитие транспортных коридоров в черноморском регионе.

На переговорах особое внимание уделялось сотрудничеству в энергетической и транспортной сферах, включая проблему транспортировки каспийской нефти. Обращаясь к участникам саммита, президент Украины Леонид Кучма предложил перекачивать каспийскую нефть из Азербайджана на Украину через Черное море, а затем в Европу. Активно лоббировала свои интересы и Турция. Возможно, именно потому Москва отнеслась к встрече в Ялте достаточно прохладно, и на саммите присутствовал не президент, а глава правительства Сергей Кириенко.

Михаил ЧЕРНОВ

Китайский вариант «Народной газеты»

Китайская газета «Женьминь Жибао» отметила 15 июня свой полувековой юбилей.

На первой странице праздничного выпуска — цветные фотографии трех поколений китайских руководителей. Мао Цзедун, Дэн Сяопин и Цзянь Цземинь сфотографированы за чтением любимой газеты. В поздравительном послании партия призвала журналистов «Женьминь Жибао» (что переводится как «Народная газета») продолжать указывать путь общественности, пропагандировать теорию, линию и политику партии и оставаться ведущей газетой страны. Газета же обязуется руководствоваться марксистско-ленинским учением, наследием Мао и теорией Дэна, прислушиваясь при этом к голосу народа и держа руку на пульсе общественных настроений.

«Женьминь Жибао» распространяется только по подписке и обязательна для всех крупных организаций страны. Однако по сравнению с 80-ми годами газета потеряла больше половины своих подписчиков, что отчасти объясняется «зубодробительностью» статей. Хотя специалисты и за этим «новоязом» ухитряются уловить колебания курса руководства страны. Ну а простые люди предпочитают партийным коммюнике хронику происшествий и новости из жизни звезд спорта и телевидения. В результате трехмиллионный тираж газеты выглядит скромным относительно численности населения — 1 миллиарда 200 миллионов, и количества членов компартии — 58 миллионов человек.

Б.П.

Латвия перестала быть ядерной державой

В эту пятницу состоится торжественное закрытие Саласпилсского ядерного реактора.

37 лет реактор *(на снимке)* трудился на благо науки и медицины, принося немалую пользу Латвии. И медицинские инструменты там стерилизовали, и фармацевтические препараты производили, и природные минералы облагораживали...

Мог бы проработать реактор еще 10-15 лет, да кончились запасы ядерного горючего, оставшегося еще с советских времен. Теперь трудяга-реактор будет остановлен и в течение ближайших десяти лет демонтирован. Обойдется удовольствие как минимум в 50 миллионов долларов.



Украина бедствует

На Украине вовсю разбушевалась стихия. На западе и в центре государства шквальный ветер с проливными дождями принесли сильные разрушения в 146 населенных пунктах, на востоке — из-за жары возникли лесные пожары.

Как сообщили в пресс-службе украинского министерства по чрезвычайным ситуациям, в минувшие выходные дни шквальный ветер до 25 метров в секунду разрушил линии электропередачи в Ровенской области, оставив без электричества 30 населенных пунктов. Разрушены частные строения.

В Тернопольской области проливными дождями размыто 2,5 тысячи гектаров сельскохозяйственных угодий. В Хмельницкой области ветер и дождь подмыли линии опор электропередачи, 124 частных дома получили значительные разрушения. Непрекращающиеся дожди оставили без электроэнергии 76 населенных пунктов Житомирской и 28 — Черкасской областей. Молния убила жительницу села Соколив в Житомирской области.

А на востоке Украины, близ Северодонецка, из-за жары, доходящей до +40°С, загорелся лес. Сильный ветер раздул огонь на площади почти в тысячу гектаров.

Правительство Украины пообещало выделить пострадавшим районам 500 тысяч гривен (250 тысяч долларов). Гуманитарную помощь уже предложило посольство США на Украине, а также благотворительные организации Дании.

Михаил ГРИГОРЬЕВ

Болгария

Кесарю – кесарево

Лишенному престола и прожившему полвека в изгнании болгарскому монарху Симеону Второму Кобург-Готскому и его родственникам уже не придется, приезжая в Болгарию, снимать номер в гостинице или ютиться на частных квартирах.

Конституционный суд Болгарии рассмотрел иск главного прокурора Ивана Татарчева и вынес вердикт о возвращении царской семье движимого и недвижимого имущества, конфискованного в пользу государства. Постановление Президиума Народного собрания (парламента) от 19 декабря 1947 г. о национализации имущества болгарских царей Фердинанда Первого, Бориса Третьего и их наследников признано противоречащим основному закону республики и подлежащим отмене.

Находящаяся с частным визитом в Софии сестра царя Симеона княгиня Мария-Луиза приветствовала решение суда. Она заявила о том, что не видит причин вновь возвращать государству то, что у ее семьи было «конфисковано коммунистами». Это было сделано именем народа, который никогда не получил доступа до царских дворцов и резиденций, сказала она. Сам Симеон Второй проявил большую осторожность и в направленной в Софию телеграмме подчеркнул, что «будущее предназначение некоторых наших владений», «насильственно отчужденных и даже не переданных в общественное пользование», следует «хорошо обдумать».

Самыми крупными приобретениями царской семьи могут стать принадлежавшие ей ранее дворцы «Врана» и «Кричим», а также загородные резиденции «Ситняково», «Сарыгьол», «Царска-Бистрица», расположенные в самых живописных уголках Болгарии и использовавшиеся царедворцами для отдыха и охоты. Кроме того, Симеон и его родственники могут вернуть немало бесценных реликвий, в том числе личную коллекцию оружия Бориса Третьего, хранящуюся в государственных фондах. К ним, впрочем, не относятся царские атрибуты — корона и жезл, купленные в свое время на средства, выделенные Народным собранием. Государственной собственностью останется и бывший царский дворец в центре Софии, на которые царская династия никогда не имела имущественных прав.

Дело в том, что основателем болгарской княжеской, а затем и царской династии Саксен-Кобург-Гота, «импортированной» из Западной Европы после освобождения страны от османского ига в 1878 г., был бедный отпрыск рода Кобургов Фердинанд. Главным источником существования его семьи на протяжении всех лет, прошедших до низложения династии в сентябре 1946 г., оставались средства госбюджета и немалые заграничные займы.

ИТАР-ТАСС

Вокруг чемпионата

Афера раскрыта

Суд Гонконга рассматривает дело одного из ведущих футболистов, который обвинен в получении взятки за поражение своей команды в отборочном матче чемпионата мира.

Чан Цзкон, говорится в обвинении, «подговорил» пятерых членов команды проиграть Таиланду за 26 тыс.долларов. В результате таиландцы одержали в Бангкоке в прошлом году победу со счетом 2:0. Все участники заговора арестованы.

Тринадцать с половиной миллионов

На чемпионате мира-98 установлен рекорд по количеству телезрителей, наблюдавших вечером в прошлую пятницу матч национальной сборной Франции с командой ЮАР.

Телеканал *France-3* передавал матч в прямой трансляции, и за ходом событий на поле наблюдали 13.508.880 телезрителей во Франции. Это абсолютный рекорд зрительской аудитории.

До этого рекорд по числу зрителей был установлен в 1995 году — и тоже во Франции, во время первого телевизионного показа художественного фильма «Пришельцы». Тогда фильм одновременно смотрели 11.572.000 зрителей.

Бедные японцы

Тысячи безбилетных японских болельщиков заполнили с утра в воскресенье улицы Тулузы, где через несколько часов начался матч сборных Японии и Аргентины. Они стали жертвами грандиозной аферы с фальшивыми «билетами-призраками». Власти Тулузы попытались хотя бы частично помочь безбилетным японцам. Вблизи футбольного стадиона и на площадях были установлены гигантские телеэкраны.

Накрыли малину

Первого успеха в борьбе с ворами-карманниками, прибывшими на «гастроли» во Францию во время футбольного чемпионата, добилась в субботу французская полиция.

В кэмпинге под Бордо она арестовала трех английских и шотландских воров, у которых было найдено множество чековых книжек, кошельков и удостоверений личности. Все это было украдено во время первого матча чемпионата между Бразилией и Шотландией 10 июня в Париже.

По ту сторону Атлантики

Американская полиция предпринимает меры на случай волнений в Нью-Йорке футбольных болельщиков различных национальностей.

Как сообщила газета *New York Times*, особенно крупные наряды полиции будут в течение месяца патрулировать район Куинз, где обосновались иммигрантские общины целого ряда футбольных держав мира. Полиция разработала специальную стратегию, которая будет применяться после каждого матча с участием команд Латинской Америки. Обычные патрули будут усилены конными подразделениями, а в резерве будут находиться специальные команды для подавления беспорядков. Полицейским не придется сидеть сложа руки, ведь в этом году, наряду с чемпионом мира — командой Бразилии, еще целый ряд команд из традиционно «темпераментных» стран входит в десятку основных претендентов на чемпионский титул — Аргентина, Колумбия, Чили и Мексика.

Беспорядки во время прошлого чемпионата в 1994 году в Нью-Йорке нельзя сравнить с побоищами, которые случались между болельщиками разных команд в Европе и Латинской Америке. Тем не менее были многотысячные демонстрации болельщиков. Например, латиноамериканские болельщики после победы сборной Бразилии над командой Италии двинулись в район компактного проживания выходцев из Италии и устроили под окнами «побежденного соперника» праздничную демонстрацию. Результатом стали ранения нескольких полицейских и арест 6 человек.

Рыцарь мяча

Легендарному английскому футболисту Джеффри Херсту — единственному сумевшему забить в финале мирового чемпионата три гола, даровано рыцарское звание.

Так спустя 32 года отмечен его вклад в победу сборной Англии над командой ФРГ в решающей встрече чемпионата–66 на лондонском стадионе *Wemdley*.

По мнению официальных представителей Букингемского дворца, рыцарское звание, дарованное королевой Елизаветой по совету премьер-министра Тони Блэра, послужит стимулом для команды Англии на финальном турнире чемпионата во Франции.

Просто Марадона

Дамоклов меч, висевший несколько лет над легендарным аргентинским футболистом Диего Марадоной, просвистел мимо.

Два года и десять месяцев тюремного заключения условно — такой приговор вынес ему суд, признав футболиста виновным в обстреле группы журналистов из пневмотического ружья. Благодаря усилиям адвокатов судебное дело тянулось более четырех лет.

В конце февраля 1994 г. Марадона, в состоянии депрессии, обстрелял аргентинских журналистов, осаждавших его загородный дом. Четверо из пострадавших подали на него в суд, предварительно засвидетельствовав у врачей полученные легкие ранения. Приговор был вынесен лишь спустя четыре года.

Диего Марадона официально не покидал большой футбол, но не играет он с прошлого года, который был для него очень неудачным, поскольку его в очередной раз обвинили в принятии допинга. В октябре 1997 г. ему исполнилось 37 лет, поэтому его возвращение на просторы футбольных полей в любом случае маловероятно. После вынесения приговора Марадона получил возможность выехать из страны, и на чемпионате мира по футболу во Франции он, несомненно, получит высокие гонорары за комментарии для телеканалов и газет.

По материалам ИТАР-ТАСС
подготовил **Семен ПЛОЦ**

Англичане разбушевались

Трое английских болельщиков уже осуждены к тюремному заключению, еще около шестидесяти ждут решения суда под арестом.



Массовые беспорядки были организованы англичанами в Марселе. Сначала они с грохотом прошлись по марсельским барам и магазинам, круша витрины и выставленные на улицах столики. Затем, столкнувшись с силами полиции, стали метать в охранников порядка бутылки и камни. Англичан удалось остановить с помощью гранат со слезоточивым газом и полицейских дубинок *(см. фото)*. Конфликт перерос в массовое побоище, потому что со всех концов Марселя стянулись местные парни, которые, вооружившись железными прутьями, бейсбольными битами и холодным оружием, устроили настоящую охоту на англичан. Ранения получили 37 человек, из них 30 англичан, один ирландец, два француза, два туниса, один алжирец.

Таким образом, трое англичан, которых суд признал зачинщиками беспорядков и обвинил в попытке поджога автомобиля, будут сидеть во французской тюрьме 4 месяца. Всем им будет запрещен въезд во Францию в течение года.

В состояние повышенной готовности приводится полиция Тулузы: следующий матч с участием английской сборной состоится 22 июня. *«Мы должны быть принципиальны и строги к хулиганам. Никакие ссылки на то, что у них было трудное детство, не могут приниматься во внимание»*, — сказал премьер-министр Британии Тони Блэр.

В Думе дело табак

Российскому генералу Лебедю и другим курящим политикам скоро придется поставить крест на своей карьере или бросить эту вредную привычку.

Законом об ограничении табакокурения, который сейчас рассматривается в Госдуме, запрещается «демонстрация курения известных общественных деятелей в средствах массовой информации, кинофильмах и спектаклях». Туго будет и простым смертным. В статье 6 записано: «Работодатель может устанавливаться более низкие размеры доплат и премиальных работникам, потребляющие табачные изделия» *(стиль сохранен)*. Зато заядлые курильщики теперь будут знать, сколько никотина и смол содержится в каждой пачке, а также без очков читать надпись о вреде курения. Она должна занимать «не менее 25% площади большей стороны упаковки».

Хорошая вещь – ненужная вещь

В некоторых странах Запада существуют «Общества бесполезных изобретений», члены которых иногда придумывают весьма занятные вещи.



По правилам международной ассоциации таких обществ, изобретатели должны создавать реально осуществимые, вполне функциональные, но в принципе бесполезные предметы. В частности, на счету японских «бесполезников» переносная пластмассовая «зебра», с помощью которой можно организовать переход через проезжую часть в любом месте. Есть также железные накладки с острыми шипами, которые надеваются на ботинки, чтобы вам не наступали на ноги. Особенно гордятся японцы электрическим фонариком, который работает от солнечных батарей *(на снимке)*.

А вот американец Дэвид Сэйдж даже запатентовал свое изобретение — специальные щипцы для формования снежков. Преимущество этой штуки в том, что не мерзнут руки и не мокнут варежки. А то, что снежок потом приходится метать вместе со щипцами, — уже не так важно.

Французы же всегда отличались особой экстравагантностью. На недавнем конгрессе «Обществ бесполезных изобретений» первое место жюри единогласно присудило презервативу, выполненному в технике макраме.

Мартышка и зеркало

Узнают ли животные себя в зеркале? Как показали опыты, узнают — но далеко не все.

Лучше всего справляются с этой задачей человекообразные обезьяны. Мартышкам и макакам на то, чтобы осознать свое отражение в зеркале, требуется несколько недель. Дельфинам достаточно нескольких часов. Добиться подобного от слонов, коров, лошадей и собак ученым не удалось.

Кстати, человек начинает осмысленно воспринимать собственное отражение в зеркале, как правило, в возрасте 12-16 месяцев.

Убийство оспы отменяется

Не только человек произошел от обезьяны, но и многие наши болезни также имеют обезьянье происхождение.

В 1979 г. Всемирная организация здравоохранения объявила, что в результате поголовной вакцинации оспа на земле окончательно уничтожена. Противооспенные прививки новорожденных прекратились. Живые культуры вируса — на всякий научный случай — остались только в двух лабораториях в России и США, но и их планировалось уничтожить 30 июня этого года.

Но за последние месяцы в Африке была зарегистрирована настоящая эпидемия так называемой обезьяньей оспы, которая, как оказалось, может массово поражать и людей. Обычная противооспенная вакцина эффективна против обезьяньей заразы, поэтому Всемирная организация здравоохранения приняла решение отложить уничтожение лабораторных вирусов оспы, чтобы на их основе можно было опять организовать производство вакцины для прививок.

Золотые Ворота оградят от самоубийц

На знаменитом мосту Золотые Ворота, что в Сан-Франциско, установят надежное ограждение, которое не позволит слабым духом сводить счеты с жизнью.

Мост построили в 1937 году, и с тех пор с его перил в залив бросились 1.200 человек. Борцы за моральное здоровье нации давно требовали поставить высокое ограждение, как это было сделано на небоскребе Эмпайр Стейт Билдинг и на Эйфелевой башне. Теперь вот и на Золотых Воротах будет установлена ограда высотой около четырех метров. Даже если самоубийца решится перелезть ограждение, полиция поспеет прежде, чем человек решится на роковой шаг.

Возраст

Самая «молодежная» страна мира — Йемен. Здесь 52% населения моложе 15 лет.

Космонавтика

Самым старым космонавтом мира может стать Джон Гленн — первый американец, полетевший в космос в 1962 году. Сейчас ему 76 лет, он член Конгресса США, но собирается оставить политику и в конце этого года вернуться в астронавты. Цель полета — изучение влияния невесомости на пожилых людей.

Вода

Плотины всех гидроэлектростанций мира удерживают столько воды, сколько ее в Черном и Азовском морях, вместе взятых.

Бизнес

По статистике, в Соединенных Штатах Америки каждые 16 секунд регистрируется новая фирма. Правда, 80% новичков живут не более 5 лет.

Дети

Английские педиатры установили тенденцию, которой пока никто не может дать объяснения. В результате наблюдения за 10.000 детей оказалось, что те дети, чьи родители развелись, отстают в росте, зато бывают толще сверстников.

Мост, который никогда не заржавеет

Завтра в датском городе Кольдинг будет небольшой местный праздник — юбилей моста.

Правда, мосту исполняется всего один год, но зато эта конструкция совершенно уникальна и не имеет в мире аналогов. Пешеходно-велосипедный мост длиной 40 метров целиком выполнен из пластмассы, а части конструкции склеены полимерным клеем. На то, чтобы собрать мост, понадобилось всего две ночи (днем не работали потому, что мешали поезда: мост висит над железнодорожным полотном). Жители Кольдинга очень гордятся этой своей пластмассовой достопримечательностью.

Под морями, под волнами

Пример сооружения тоннеля под проливом Ла-Манш между континентальной Европой и Британией оказался заразительным.

Теперь французские и английские инженеры работают над проектом второго тоннеля — автомобильного, длиной 50 километров. Проект должен быть готов к 2000 году, а строительство предполагается начать в 2005 году. Есть, однако, одна загвоздка: правительства в Лондоне и Париже очень хотят иметь такой тоннель, но финансировать его не собираются — англичане и французы считают, что это должно стать общим делом всей Европы.

Полоса подготовлена по сообщениям информационных агентств и материалам зарубежной прессы

© НАВІНЫ. Спасылка на газету НАВІНЫ абавязковая. Падпісны індэкс 63312 E-mail: edit@svaboda.minsk.by Пасведчанне аб рэгістрацыі № 996. Юрыдычны адрас рэдакцыі: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» ВПП імя Я.Коласа (220073 г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) Заказ 1202 Нумар падпісаны ў друк 16.06.98 (15:00) Наклад — 18.450